Падтрымай "Вясну" на PATREON

Тры гады калоніі — за "тры ўдары нагой" міліцыянту падчас аднаго з маршаў

09.07.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, грамадства, ціск



Павел Ларчык. Фота: "Гомельская Вясна"

У судзе Цэнтральнага раёну Гомеля вынесены прысуд 24-гадоваму Паўлу Ларчыку. Яго асудзілі да трох гадоў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму. Пракурорка Кружнова прасіла пазбавіць яго волі на тры з паловай гады.

Яго прызналі вінаватым паводле арт. 364 Крымінальнага кодэкса. Справу разгледзела суддзя **Алеся Осіпава**.

Паўла абвінавацілі гвалце над міліцыянтам — інспектарам Чыгуначнага АУСу **Паўлам Шапавалавым** на Маршы пратэсту 20 верасня 2020 года. Згодна з абвінавачаннем, калі Шапавалаў затрымліваў Ларчыка, хлопец *"нанёс тры ўдары нагой Шапавалаву — у апошняга былі крывападцёкі"*.



Гамельчука пачалі судзіць за "тры ўдары нагой" міліцыянту падчас аднаго з маршаў

Паўла вінавацяць у гвалце над міліцыянтам — інспектарам Чыгуначнага АУСу Паўлам Шапавалавым на Маршы пратэсту 20 верасня 2020 года.

На сённяшнім пасяджэнні Павел Ларчык звярнуўся да суда з апошнім словам, перадаюць "Сильные Новости":

> *— У першую чаргу, я хачу папрасіць прабачэння ў супрацоўніка міліцыі, які пацярпеў ад маіх дзеянняў,* — сказаў Павел. *— Я шчыра раскайваюся ў тым, што адбылося. Я ўпершыню ў жыцці апынуўся пад следствам і паўстаў перад судом. За той час, які я правёў у СІЗА, я многае пераасэнсаваў.*

Павел Ларчык папрасіў суд абраць для яго меру пакарання, не звязаную з пазбаўленнем волі:

> *— Вельмі вас прашу не разлучаць мяне з маімі роднымі. Я хачу жыць з сям'ёй і для сям'і. Хачу дапамагаць сваім пажылым бацькам: бацьку і маці — пенсіянерцы. Хачу стварыць уласную сям'ю з каханай дзяўчынай, якая мяне вельмі чакае.*

Павел Ларчык запэўніў суд, што больш ніколі не будзе цікавіцца палітыкай, а прысвеціць сваё жыццё любімай справе — музыцы.

Твитнуть







"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі трэмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

Дайджэст вызваленых: 12 палітвязняў у сакавіку цалкам адбылі тэрміны і выйшлі на волю

"Могуць з'яўляцца злачынствамі супраць чалавечнасці". Што азначае гэтая фармулёўка ў дакладзе ААН пра Беларусь?

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023









ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY